

ДАПАМОГА З АДРАСАМІ

3

СКАЛЬПЕЛЬ ЗАМЕСТ ПЭНДЗЛЯ



9

Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

11 МАЯ 2024 г. СУБОТА № 92 (30226)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Валерый КАВАЛЬКОЎ, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны:**

*«Паводле апошняга перапісу насельніцтва, 44 % сем'яў, а гэта каля 1 млн, маюць дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў. Большасць з іх (57 %) маюць адно дзіця. Двое дзяцей — у кожнай трэцяй сям'і. І 9,2 працэнта — шматдзетныя. Згодна з Кодэксам аб шлюбе і сям'і, шматдзетнай сям'ёй лічыцца толькі тая сям'я, якая выхоўвае траіх дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў. Калі мы гаворым, што шматдзетных толькі 9 %, трэба разумець, што сем'яў з трыма дзецьмі значна больш. Проста дзеці ўжо перасягнулі ўзрост 18 гадоў».*

# Адлюстраванне лёсу нашага народа

*Паважаныя суайчыннікі!*

*Ад усёй душы віншую вас з Днём Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь.*

*У гэтых сімвалах знаходзіць сваё адлюстраванне лёс народа, яго нялёгкі шлях да міру і стваральнай працы на роднай зямлі. Кожнае слова гімна, кожны элемент сцяга і герба нябачна раскрываюць рэтраспектыву жыцця беларусаў ад самых вытокаў да яркіх здзяйсненняў сённяшняга дня.*

*Дзяржаўныя сімвалы суверэннай Беларусі ўвасабляюць выдатныя дасягненні сучаснікаў: узыходжанне на Эверэст і пакарэнне космасу, навуковыя адкрыцці і перамогі ў спорце, стварэнне высокатэхналагічных вытворчасцяў і ўнікальных твораў мастацтва, моц і абараназдольнасць Айчыны. У іх — гонар за нашу краіну і наш народ.*

*У гэты святочны майскі дзень жадаю вам, дарагія земляк, моцнага здароўя, сямейнага шчасця, радасці і новых поспехаў на карысць Радзімы.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Паўсюль у краіне гэтымі днямі ўшаноўваюць нашы дзяржаўныя сімвалы. Гэты здымак фотакарэспандэнт «Звязды» Віктар Іванчыкаў зрабіў у Заводскім раёне сталіцы падчас патрыятычнай акцыі «Спяём гімн разам». Пад гукі Дзяржаўнага гімна, якія выканалі кіраўнікі адміністрацыі раёна, прадстаўнікі працоўных калектываў, устаноў адукацыі, ваеннаслужачыя вынеслі і разгарнулі вялікі Дзяржаўны сцяг.

## КОРАТКА

- **У Беларусі створана дзяржкамісія па кантролі за ўступнай кампаніяй 2024 года.**
- У студзені — сакавіку 2024 года знешнегандлёвы абарот тавараў і паслуг Беларусі павялічыўся на 1,1 працэнта да $23,374 млрд.
- **У Беларусі завяршылі сяўбу цукровых буракоў.**
- На Беларускай універсальнай таварнай біржы зарэгістравана першая транзітная здзелка па рэалізацыі сметанковага масла.
- **У 14 раёнах Гомельскай вобласці пачалі касьбу траў.**

# СІМВАЛЫ НАШАЙ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

**Заўтра ўся краіна адзначыць Дзень Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба, Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь. Менавіта так — з вялікай літары. Так яно і павінна быць, а мы самі, здаецца, толькі цяпер пачынаем разумець, як многа гэтыя сімвалы значаць у жыцці не толькі дзяржавы — кожнага з нас. Бо менавіта яны — пацвярджэнне таго, што мы жывём у незалежнай суверэннай краіне і можам самі, без падказкі аднекуль, вырашаць яе шлях і лёс.**

**Напярэдадні свята мы спыталіся ў нашых чытачоў, што для іх азначаюць дзяржаўныя сімвалы Беларусі. Кожны гаварыў у нейкай меры пра сваё асабістае, але ж атрымалася — пра ўсю краіну.**

СТАР. 4-5

Ведай нашых



# ПАТРЫЯТЫЗМ ЯК ДУШЭЎНАЯ ПАТРЭБА

**«Асцярожна, бабуля!» — як у бліскучай савецкай стужцы — аб сваім незвычайна дарагім сэрцу чалавеку — любімай бабулі Любові Мацвееўне Родавай, — можа сказаць і гамяльчанка Марына Гулевіч. Суперадказная, актыўная, неабыякавая, гатовая заўсёды прыйсці на дапамогу... Усё гэта аб Любові Родавай. Яе імя — ключ да сэрцаў не адной тысячы жыхароў аграгарадка Уваравічы Буда-Кашалёўшчыны і ўсяго раёна. Яе ўнучка — Марына Гулевіч — следчы па асабліва важных справах следчага ўпраўлення УСК па Гомельскай вобласці таксама нарадзілася і вырасла ва Уваравічах. Сёння яна і яе родныя працягваюць справу ўсяго жыцця Любові Родавай. Гэтымі майскімі днямі Вялікай Перамогі і напярэдадні асаблівага дня ў праваслаўным календары — Радаўніцы, калі, часам праз тысячы кіламетраў людзі імкнуцца пабыць на малой радзіме, пакланіцца сваім спачылым родным, нельга не расказаць пра гэту дзіўную сям'ю.**

СТАР. 8

ISSN 1990 — 763X

24092

Блізкая ўлада

# «Мы дакладна разумеем, што гэта наша зона адказнасці»

## У Гомелі прайшло выязное пасяджэнне Прэзідыума Савета Рэспублікі



Фота БелТА.

**На сустрэчы пад старшынствам кіраўніка Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ была прааналізавана работа са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб у першым квартале бягучага года. Прааналізавалі і вынікі адзінага дня прыёму грамадзян, які члены Савета Рэспублікі правялі 2 мая ва ўсіх раёнах Гомельшчыны.**

Удзел у пашыраным пасяджэнні прынялі старшыня аблвыканкама Іван Крупко, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці Юрый Горлаў, старшыня абласнога Савета дэпутатаў Кацярына Зенкевіч, а таксама сенатары, старшыні Гомельскага гарадскога і раённага выканкамаў, члены Маладзёжнага парламента. У пасяджэнні ў рэжыме відэаканферэнцыі ўдзельнічалі 22 студыі з раёнаў вобласці: да прамога эфіру падключыліся кіраўнікі райвыканкамаў і сельсаветаў.

У сваім звароце да прысутных Наталля Качанава адзначыла, што практыка выязных прыёмаў па асабістых пытаннях добра сябе зарэкамендавала, ёсць вынікі. Сёння асноўны пасыл у гэтай дзейнасці — «не нашых пытанняў няма» .

— Гэта жыццё, і пытанні заўсёды былі, ёсць і будуць. Калі да нас звяртаюцца людзі, мы стараемся дапамагчы, вырашаць пытанні аператыўна, — падкрэсліла яна. — Мы дакладна разумеем, што гэта наша зона адказнасці. Няма невырашальных пытанняў. Не заўсёды звароты патрабуюць кардынальных мер і дзеянняў. Нярэдка дастаткова ўсё растлумачыць чалавеку, праінфармаваць.

Што датычыцца работы з людзьмі на месцах, упэўнена Старшыня Савета Рэспублікі, неабходна выбудаваная сістэма работы са зваротамі грамадзян, даступнасць звароту і дапамога ў вырашэнні праблемнай сітуацыі.

— Гэта ўнікальныя формы работы, калі чалавек можа звярнуцца да дэпутата любога ўзроўню. Кожны зварот мы ўважліва і старанна разглядаем, — падкрэсліла Наталля Качанава.

Ацэньваючы вынікі работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб на Гомельшчыне за азначаны перыяд, Наталля Качанава заўважыла, што з апошняга адзінага дня прыёму грамадзян у рэгіёне членамі Савета Рэспублікі сітуацыя змянілася ў лепшы бок. Спікер адзначыла і работу супрацоўнікаў інфармацыйна-аналітычнай службы Гомельскага аблвыканкама, якія аналізуюць анлайн-звароты, што паступаюць у райвыканкамы, і даюць зваротную сувязь людзям аб тым, што ўжо зроблена. Як падкрэсліла Наталля Качанава, гэты вопыт варта пераймаць у іншых рэгіёнах.

— Відаць, што ў вобласці праводзіцца сістэмная работа з людзьмі на месцах, іх пытанні паступова вырашаюцца, — падкрэсліла яна. — Важна, што сёння ёсць разуменне: людзей трэба інфармаваць аб тым, што будзе зроблена ў кожным канкрэтным раёне, горадзе, вёсцы, і тады людзі будуць разумець: так, не ўсё робіцца адразу і хутка, але яны будуць ведаць, калі чакаць рашэнняў. Іх пацвярджае і фінансаванне на год. І сёння мы пачулі дакладныя планы на 2024 год, — звярнула ўвагу Наталля Качанава.

Спікер ахарактарызавала ў цэлым, як прайшоў адзіны дзень прыёму грамадзян у Гомельскай вобласці.

— Прынялі ў адзіны дзень прыёму парадку 90 зваротаў. Практычна не было пытанняў, якія датычацца сацыяльнай сферы. Пры гэтым значная частка зваротаў датычылася якасці дарожнага пакрыцця праезнай часткі вуліц. Так, людзей хвалюе рамонт дарог мясцовага значэння. З губернатарам мы абмеркавалі, гэтыя пытанні будуць узяты на кантроль і вырашаны ў найбліжэйшы час, тым больш для гэтага ўсё ёсць.

Між тым, як было адзначана на пасяджэнні прэзідыума, за першы квартал бягучага года ў Савет Рэспублікі паступіў 171 зварот ад жыхароў Гомельшчыны. У мінулым годзе рэгіён заставаўся на 5 месцы па колькасць зваротаў сярод абласцей Беларусі, сёлета — на 4-м. Часцей за ўсё звароты адрасавалі жыхары Гомеля, Гомельскага, Мазырскага, Жыткавіцкага раёнаў.

На пасяджэнні прэзідыума былі агучаны вынікі работы са зваротамі грамадзян у Савеце Рэспублікі ў мінулым годзе і бягучым. Як было адзначана, у 2023 годзе парламентарыямі было праведзена больш як 710 асабістых прыёмаў, 360 прамых тэлефонных ліній, больш чым дзве тысячы сустрэч у працоўных калектывах і з насельніцтвам на месцах. У цэлым па выніках мінулага года членамі Савета Рэспублікі разгледжана больш як 7,5 тысячы зваротаў. За першы квартал бягучага года колькасць зваротаў павялічылася на пяць працэнтаў у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года.

Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу ўдзельнікаў выязнога пасяджэння прэзідыума на важнасць работы з людзьмі на месцах і ў плане заканатворчай дзейнасці.

— Устаноўка нашага Прэзідэнта — законы павінны ісці ад жыцця. Таму так важна сенатарам сустракацца з грамадзянамі, слухаць і чуць іх. Не заўсёды трэба прымаць кардынальныя рашэнні, часам дастаткова проста пагаварыць, праінфармаваць, што адбываецца ў рэгіёне, растлумачыць некаторыя пытанні, — падкрэсліла Наталля Качанава.

Пасля завяршэння работы пашыранага выязнога пасяджэння Прэзідыума Савета Рэспублікі яго ўдзельнікі ўшанавалі памяць загінулых герояў Вялікай Айчыннай вайны і ўсклалі кветкі да Брацкай магілы савецкіх воінаў і падпольшчыкаў на плошчы Працы ў Гомелі.

У Гомелі пры ўдзеле Наталлі Качанавай таксама адкрылі плавальны басейн «Дэльфін».

Як адзначыла Наталля Качанава, у Беларусі год ад году ўмацоўваецца сацыяльная палітыка. «З вялікай радасцю разам з членамі Савета Рэспублікі прынялі запрашэнне адкрыць гэты басейн. Разумеем наколькі важна для краіны здароўе нашых грамадзян. І сацыяльная палітыка, якая праводзіцца ў нашай краіне, накіравана перш за ўсё на нашых людзей, на іх здароўе, дабрабыт і паспяховае развіццё. Хацела б падзякаваць кіраўніцтву вобласці і горада за тое, што прымаюць такія абсалютна правільныя рашэнні і робяць усё для таго, каб людзям было яшчэ больш камфортна ў родным горадзе, ствараюць для іх камфортныя ўмовы, магчымасць прафесійна займацца спортам. Упэўнена, што гэты аб'ект будзе запатрабаваны. Наша нацыя павінна быць моцнай і здаровай».

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

Клопат

# У новым статусе — пад новым дахам

## Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЕЕНКА ўзяў удзел у адкрыцці новага корпуса Александроўскага псіханеўралагічнага дома-інтэрната

**Сучасны сацыяльны аб'ект расчыніў дзверы для 105 жыхароў Шаркаўшчынскага раёна Віцебскай вобласці.**

Дзяржаўная ўстанова сацыяльнага абслугоўвання «Александроўскі псіханеўралагічны дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў» вядзе свой адлік з 1955 года. За сем дзесяцігоддзяў існавання яна змяніла некалькі назваў, а з ліпеня бягучага года, як і астатнія па ўсёй краіне, набудзе новы статус — сацыяльны пансіянат. Па словах **намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Марыны АРЦЁМЕНКІ**, такое рашэнне на ўзроўні краіны было прынята невыпадкова: частая поўная назва ўстановы з кірункам дзейнасці цяжка ўспрымаецца і пераносіцца пажылымі людзьмі, таму з ліпеня ўсе дамы-інтэрнаты будуць перайменаваны ў сацыяльныя пансіянаты.



Да пачатку будаўніцтва новага трохпавярховага корпуса людзі пражывалі ў адным цагляным і пяці драўляных карпусах. Цяпер велічны будынак пад блакітным дахам звонку і ўнутры падобны да санаторыя і разлічаны на 105 месцаў. Гэта дазволіць не толькі павялічыць умяшчальнасць сацыяльнага аб'екта, але і палепшыць умовы пражывання. А яшчэ тут будуць аказваць новую паслугу для насельніцтва Шаркаўшчынскага раёна — ужо абсталяваны пакоі для дзённага знаходжання пажылых людзей — «дзіцячы садок» для бабуль і дзядуляў.

У цырымоніі адкрыцця новага аб'екта ўзялі ўдзел ганаровыя госці: Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар Сергеенка, старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Субоцін, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Марына Арцёменка, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Віцебскай вобласці Сяргей Ляўковіч, старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне аблвыканкама Барыс Яфрэмаў. Перад пачаткам мерапрыемства ўдзельнікі азнаёміліся з дзейнасцю Тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва паўночнага рэгіёна на арганізаваных падворках. Акрамя традыцыйных сувенірных вырабаў, госці ацанілі бутаньеркі з сімволікай будучага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, якія вырабляюць наведвальнікі Полацкага ТЦСАН.

Звяртаючыся да ўдзельнікаў цырымоніі, **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЕЕНКА** адзначыў, што адкрыццё новага корпуса сімвалічна прымеркавана да Года якасці, важнай умовай праваздзення якога з'яўляецца павышэнне якасці жыцця людзей і вырашэнне іх праблем. «Кіраўніцтва нашай краіны, органы мясцовай улады ўдзяляюць вялікую ўвагу гэтай рабоце, бо Беларусь — сацыяльна арыентаваная дзяржава. Сёння, напэўна, няма больш высакароднай задачы, чым стварэнне для людзей з абмежаванымі магчымасцямі і пажылых камфортных умоў. Новы корпус — значная падзея не толькі для Шаркаўшчыны, але і для ўсёй сацыяльнай сферы вобласці. Хацелася б выказаць словы шчырай падзякі будаўнікам, якія за паўтара года ўзвялі гэты аб'ект. Асаблівыя словы падзякі — персаналу дома-інтэрната, тым людзям, які ствараюць утульнасць, ахінаюць клопатам сваіх падапечных. Жадаю поспехаў у вашай нялёгкай рабоце, высокіх маральных каштоўнасцяў», — сказаў Старшыня Палаты прадстаўнікоў і ўручыў дырэктару ўстановы Мар'яну Паўловічу сертыфікат на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы.

**Кіраўнік Віцебшчыны Аляксандр СУБОЦІН** павіншаваў прысутных са святамі, падзякаваў вялікаму зладжанаму калектыву, які стаяў за будаўніцтвам новага аб'екта, і выказаў надзею, што пад гэтым дахам нашы грамадзяне будуць адчуваць сябе надзейна і пад аховай.

Намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Марына Арцёменка падкрэсліла, што адкрыццё сацыяльнага аб'екта ў рамках святкавання Дня Перамогі — гэта чарговы падарунак нашым людзям, вялікі ўклад у клопат аб тых, хто мае ў ім патрэбу. «Неабходнасць узвядзення падобных аб'ектаў дыктуюць дэмаграфічныя рэаліі краіны і само жыццё. Дзякуй кіраўніцтву вобласці за падтрымку і разуменне таго, што сацыяльная сфера не другасная, а патрабуе значных фінансавых укладанняў. Мясцовым органам улады — за вырашэнне пытанняў на высокім арганізацыйным узроўні, камітэту — за работу на апярэджанне. Глабальная задача для нашай краіны сёння — каб не было дзяцей-сірот і старых-сірот, чалавек мае правa на сям'ю. На калектыў дома-інтэрната ўскладзена вялікая адказнасць, калі ласка, стварайце сям'ю!» — адзначыла Марына Барысаўна.

Кожны з гасцей падарыў установе сертыфікат на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы, **дырэктар установы Мар'ян ПАЎЛОВІЧ** у сваю чаргу ўручыў падзякі прадстаўнікам улады за садзейнічанне і падтрымку. Пасля ўдзельнікі мерапрыемства прайшлі з экскурсіяй па новым корпусе і на свае вочы ацанілі высокі ўзровень аказання сацыяльных паслуг.

У гэты ж дзень Старшыня Палаты прадстаўнікоў сустрэўся з кіраўніцтвам Шаркаўшчынскага райвыканкама і даверанымі асобамі ў акрузе ад раёна. Былі разгледжаны звароты і наказы выбаршчыкаў. Асаблівая ўвага была аддадзена актуальным пытанням сацыяльна-эканамічнага развіцця раёна.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.**
*г. п. Шаркаўшчына.*

# Дапамога з адрасам

## На якую падтрымку могуць разлічваць шматдзетныя сем'і?

**У Беларусі больш за 123 тысячы шматдзетных сем'яў. Іх колькасць павялічваецца ў краіне апошнія гады, у многім дзякуючы мерам дзяржаўнай падтрымкі. Ільготы і гарантыі такім сем'ям выдзяляюцца ў розных сферах: ад выплаты дапамогі ў сувязі з нараджэннем і выхаваннем дзяцей да дзяржаўнай падтрымкі пры будаўніцтве і рэканструкцыі жылля. Ёсць шэраг мер падтрымкі ў Працоўным і Падатковым кодэксе, а таксама пры атрыманні адукацыі. Падрабязна пра іх расказалі спецыялісты.**

### САЦЫЯЛЬНЫЯ ГАРАНТЫІ

**Намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Вольга ВАСІЛЕЎСКАЯ** адзначыла, што ў Беларусі дзейнічае разгалінаваная сістэма дзяржаўных дапамог — усяго 11 відаў. Гэта дапамогі па мацярынстве, сямейныя, па часовай непрацаздольнасці па доглядзе дзяцей.

— Памер дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў дыферэнцыраваны ў залежнасці ад чарговасці нараджэння дзяцей і залежыць ад сярэднямесячнай заработнай платы работнікаў у краіне. На першае дзіця выплачваецца 35 % сярэднямесячнай заработнай платы, на сёння гэта 724 рублі. На другога і наступнага дзяцей памер дапамогі павялічаны да 40 %, — нагадала Вольга Васілеўская.

Памеры аднаразовай дапамогі, якая выплачваецца пры нараджэнні дзіцяці, таксама дыферэнцыраваны ў залежнасці ад чарговасці нараджэння дзяцей. На першае дзіця маці атрымлівае 10 бюджэтаў пражытачнага мінімуму (БПМ), на сёння гэта больш за чатыры тысячы рублёў, на другое і наступных — 14 БПМ.

Істотнай падтрымкай беларускіх сем'яў з'яўляецца і дзейная ў Беларусі з 2015 года праграма сямейнага капіталу.

— Праграма дае свае вынікі: павялічваецца нараджэнне ў сем'ях трэціх і наступных дзяцей, — падкрэсліла Вольга Васілеўская. — У Мінску з кожным годам колькасць шматдзетных сем'яў расце, сёння іх больш за 17 тысяч. На 1 студзеня гэтага года памер сямейнага капіталу складае 31 480 рублёў. У Мінску з 2015 года адкрыта больш чым 19 тысяч дэпазітных рахункаў.

Спецыяліст дадала, што сямейны капітал прызначаецца пры нараджэнні трэцяга ці наступных дзяцей, але толькі адзін раз. І ў сям'і ёсць магчымасць скарыстаць яго сродкі па пэўных кірунках: будаўніцтва жылля і паляпшэнне жыллёвых умоў, адукацыя і медыцынскія паслугі. Большасць сем'яў датэрмінова выкарыстоўвае яго для паляпшэння жыллёвых умоў.

### ШТО ЗМЕНІЦЦА Ў СЯМЕЙНЫМ КАПІТАЛЕ?

З 28 мая бягучага года ўступяць у сілу змяненні, накіраваныя на ўзмацненне сацыяльнай адказнасці сям'і пры датэрміновым выкарыстанні сямейнага капіталу. Як патлумачыла Вольга Васілеўская, бываюць выпадкі, калі дзеці ў сем'ях знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. У такім выпадку сямейны капітал назначаны не будзе, гэтак жа як не будзе дазволена яго датэрміновае выкарыстанне, пакуль сітуацыя ў сям'і не палепшыцца і статус не будзе зняты.

Акрамя таго, для павышэння сацыяльнай адказнасці прызначэнне сямейнага капіталу стане магчымым толькі пры ўмовах занятасці бацькі ў поўнай сям'і ці аднаго з бацькоў у няпоўнай сям'і. У выпадку прызначэння сямейнага капіталу бацька ў поўнай сям'і ці адзін з бацькоў у няпоўнай павінны быць працаўладкаванымі цягам 6 месяцаў з 12, якія папярэднічаюць прызначэнню сямейнага капіталу, а таксама 12 месяцаў з 24 — пры датэрміновым яго выкарыстанні.

Сродкі сямейнага капіталу для атрымання медыцынскіх паслуг можна будзе скарыстаць па пэўных кірунках толькі у адносінах дзяржаўнай аховы здароўя. У сферы адукацыі аплата за навучанне будзе пералічвацца не наперад за ўвесь перыяд, а толькі за адзін год. Выкарыстанне сямейнага капіталу на паляпшэнне жыллёвых умоў таксама перагледжана. Такая магчымасць будзе давацца сем'ям пры ўмове, што на кожнага члена сям'і прыпадае менш чым 15 метраў (менш чым 10 — у Мінску) жылля, якое знаходзіцца ва ўласнасці. У разлік будзе брацца ўся маёмасць на тэрыторыі краіны, акрамя старых дамоў.

### ПРАЦОЎНЫЯ І ПАДАТКОВЫЯ ЛЬГОТЫ

Шэраг ільгот прадугледжвае заканадаўства для сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей. Працоўны кодэкс устанаўлівае асаблівасці працы жанчын і асоб з сямейнымі абавязкамі, уключаючы такія пытанні, як забарона на прыцягненне жанчын да пэўных відаў цяжкіх работ, да звышурочных работ, рэгуляванне выдзялення водпускаў. У прыватнасці, за першы працоўны год наймальнік абавязаны даць працоўным водпускі да заканчэння шасці месяцаў работы перад водпускам па цяжарнасці і родах ці пасля яго. Таксама маці, якія выхоўваюць дваіх і больш дзяцей ва ўзросце да 14 гадоў, і бацькам, якія выхоўваюць дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, даецца першачарговае права на водпуск у зручны час.

Шматдзетным сем'ям гарантуюцца падатковыя льготы па асобных кірунках, у прыватнасці льготы па зямельным падатку, падатак на нерухомасць, стаўка па падаходным падатку.

Сем'ям, якія выхоўваюць траіх і больш дзяцей, прадугледжана выплата штогадовай матэрыяльнай дапамогі да навучальнага года на кожнага навучэнца ўстаноў сярэдняй і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў памеры 30 % БПМ. У 2023 годзе ў Мінску такую дапамогу атрымалі больш чым 33 тысячы непаўналетніх дзяцей.



Дзяржаўную адрасную дапамогу сёння атрымліваюць сем'і з дзецьмі, якія маюць нізкі ўзровень даходу. Гэта матэрыяльная падтрымка ў выглядзе аднаразовай ці штомесячнай сацыяльнай дапамогі. Таксама ў такіх сем'ях ёсць магчымасць атрымаць бясплатнае харчаванне для дзяцей першых двух гадоў жыцця. Для гэтага трэба звярнуцца ў органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы пражывання і прадставіць пакет дакументаў.

### ЖЫЛЛЁВАЕ ПЫТАННЕ ЗНЯТА

**Старшыня грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя шматдзетных бацькоў» Таццяна КРАЎЧАНКА** засяродзіла ўвагу на вырашэнні жыллёвай праблемы шматдзетных сем'яў. Яна паведаміла, што ў 2006 годзе ў Мінску было дзве тысячы такіх сем'яў, у краіне — 53 тысячы, цяпер жа ў Мінску іх больш за 17 тысяч, а па краіне — больш за 123 тысячы. І нагадала, што ў пачатку 1990-х галоўнай праблемай для шматдзетных сем'яў было жыллё. Праблема паспяхова вырашаецца з 2000 года пасля першага ўказа Прэзідэнта аб выдзяленні льготнага жылля і льготных крэдытаў.

— Вось што азначае палітыка дзяржавы, якая цяпер у нас праводзіцца. Яшчэ тры гады таму ў нашу арганізацыю звярталіся сем'і па вырашэнні праблем жылля. Цяпер ніхто не звяртаецца, бо ў Мінску кожная шматдзетная сям'я цягам года становіцца на ўлік і ёй прапануецца будаўніцтва. Добра, што пытанне па прадастаўленні жылля вырашана, — адзначыла Таццяна Краўчанка.

### ІЛЬГОТНЫ КРЭДЫТ НА АДУКАЦЫЮ

Дзяржаўныя гарантыі па падтрымцы сям'яў з дзецьмі рэалізоўваюцца і сістэмай адукацыі. Як расказала **галоўны спецыяліст упраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Алена ВАЙЦЯХОВІЧ**, асаблівай падтрымкай карыстаюцца шматдзетныя сем'і, сем'і, якія прынялі на выхаванне дзяцей-сірот, і сем'і, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў.

Найперш дзяржава прымае шэраг мер для атрымання дзецьмі дашкольнай адукацыі, у тым ліку дзецьмі са шматдзетных і малады сем'яў. У Беларусі, дарэчы, адзін з самых высокіх сярод краін СНД паказчык па ахопе дзяцей дашкольнай адукацыяй. Доля малых ад года да шасці гадоў, якія яе атрымліваюць, складае амаль 89 %. А падрыхтоўкай да навучання ў школе ахоплена 100 % дзяцей пяцігадовага ўзросту.

Для забеспячэння даступнасці і якасці дашкольнай адукацыі прымаецца шэраг мер, найперш гэта будаўніцтва ўстаноў дашкольнай адукацыі. У 2023 годзе іх адкрыта 15, у бягучым годзе запланавана пабудаваць столькі ж. Дзеці, якія не могуць наведваць установы дашкольнай адукацыі, забяспечаны яе атрыманнем дома. На партале Мінадукацыі і сайтах камітэтаў па адукацыі размешчана інфармацыя аб свабодных месцах у дзіцячых дашкольных установах. Арганізаваны падвоз звыш дзевяці тысяч выхаванцаў да ўстаноў дашкольнай адукацыі, у якіх маюцца свабодныя месцы.

Рэалізоўваюцца і іншыя гарантыі, сярод іх — ільготы па аплаце за харчаванне дзяцей, якія атрымліваюць адукацыю на розных узроўнях. Такі від падтрымкі прадугледжаны і для шматдзетных сем'яў. У дзіцячых садках плата за харчаванне зніжаецца на 30 % для сем'яў, якія маюць двух дзяцей, што атрымліваюць дашкольную адукацыю. У школах для сем'яў, якія маюць трох і больш дзяцей ці дзяцей-інвалідаў, таксама прадугледжаны льготы па аплаце харчавання.

Дзейнічае і шэраг іншых гарантый для шматдзетных сем'яў. Гэта зніжэнне аплаты за карыстанне падручнікамі і навучальнымі дапаможнікамі на 50 %, бясплатны прыём і рэгістрацыя дакументаў для ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні ў абітурыентаў, ільготы пры паступленні ва ўстановы прафесійнай адукацыі. Прадугледжаны зніжкі для атрымання адукацыі ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, якія даюцца для асобных катэгорый студэнтаў і навучэнцаў, у тым ліку шматдзетных сем'яў, а таксама атрыманне крэдыту на льготных умовах для аплаты навучання дзяцей, якія атрымліваюць першую вышэйшую адукацыю.

Падчас летняй аздараўленчай кампаніі ў дзяцей са шматдзетных сем'яў ёсць права на паўторнае цягам каляндарнага года атрыманне пуцёўкі ў лагер з кругласутачным знаходжаннем на тэрмін не менш за 15 дзён, цана якой змяншана за кошт дзяржаўных сродкаў.

Як дадала Алена Вайцяховіч, рэалізоўваецца шэраг мер падтрымкі для сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў. У цяперашні час каля 13 тысяч дзяцей-сірот выхоўваецца ў 7700 замяшчальных сем'ях. Гэта і апякунскія, і прыёмныя сем'і, і дзіцячыя дамы сямейнага тыпу. Для іх прадугледжаны штомесячныя грашовыя выплаты на ўтрыманне дзяцей-сірот, а таксама кампенсацыя сродкаў па камунальных паслугі, якія звязаны з выхаваннем дзяцей. Меры падтрымкі прадугледжаны і для сем'яў, якія ўсынавілі дзяцей. Сёння на выхаванні ўсынавіцеляў знаходзіцца больш за сем тысяч дзяцей.

**Алена КРАВЕЦ.**

# Беларусь — на XIX Кніжным салоне ў Санкт-Пецярбургу

**З 15 да 20 мая дэлегацыя Міністэрства інфармацыі, кнігавыдавецкіх структур нашай краіны ўдзельнічае ў XIX Санкт-Пецярбургскім міжнародным кніжным салоне. Сярод удзельнікаў выставачнага стэнда «Кнігі Рэспублікі Беларусь» — і Выдавецкі дом «Звязда».**

Расказвае **супрацоўнік «Звязды» Людміла ДРАЗДОВА**:

— У нашага Выдавецкага дома добра развіты стасункі з расійскімі калегамі. Мы традыцыйна ўдзельнічаем у кніжных выстаўках у Маскве. Дарэчы, сярод аўтараў кніг, выдадзеных у нас у розныя гады, — расійскія літаратары Яўген Еўтушэнка, Валянцін Распуцін, Алесь Кажадуб, Валерый Казакоў, Барыс Косцін, Мікалай Чаркашын, Аляксандр Чэрняк... Іх кнігі выдадзены ў нас на рускай мове. Выдавецкі дом «Звязда» ў свой час ініцыяваў выпуск літаратурна-мастацкіх альманахаў «Созвучие», серыю «Сябрына: паэзія народаў Расіі»...

***— Якія кніжныя навінкі прадставіце на Санкт-Пецярбургскім салоне?***

— Згаданыя альманахі, у прыватнасці «Созвучие. Беларусь — Санкт-Петербург», «Созвучие. Беларусь — Москва». А таксама — шэраг філакартычных альбомаў вядомага нашага аўтара і калекцыянера старых паштовак Уладзіміра Ліхадзедава. Сярод іх — і кніга з рэпрадукцыямі паштовак, іншага ілюстрацыйнага матэрыялу «Блакада».

Акрамя Выдавецкага дома «Звязда», на стэндзе беларускіх кніжнікаў будуць прадстаўлены выданні «Беларусь», «Мастацкай літаратуры», «Беларускай навукі». Галоўнае месца сярод прэзентацый зоймуць кнігі, выданне якіх прымеркавана да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 80-годдзя Вялікай Перамогі.

**Раман СЭРВАЧ.**

# СІМВАЛЫ НАШАЙ

## «Гэта найважнейшы палітычны, ідэалагічны і сацыяльна-культурны набытак»

**Як адзначыў старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Ігар МАРЗАЛЮК, для кожнай дзяржавы яе найважнейшымі, існымі ў непарыўным трыадзінстве сімваламі з'яўляюцца герб, сцяг і гімн. «Гэта неад'емныя атрыбуты дзяржаўнасці і суверэнітэту, — падкрэсліў дэпутат. — Яны адлюстроўваюць культурны і духоўны стан грамадства, яго традыцыйныя каштоўнасці, светапогляд, адносіны да ўлады. Вывучэнне гісторыі і сутнасці дзяржаўных сімвалаў Беларусі мае велізарнае значэнне для фарміравання пачуцця супольнай нацыянальнай агульнасці. Герб, сцяг, гімн — гэта скарбніца нацыянальнай культуры, адлюстраванне на ўзроўні сімвалаў гісторыі народа і яго дзяржаўнасці. Яны, сімвалы, з'яўляюцца прадметамі нацыянальнага гонару, аб'ектамі адлюстравання патрыятычных пачуццяў. Любоў і павага да Айчыны непарыўна звязаны з правільным выкарыстаннем дзяржаўнай сімволікі. Герб, сцяг, гімн, як афіцыйныя геральдычныя сімвалы, займаюць адметнае месца ў любой дзяржаве. Яны з'яўляюцца спецыфічным адлюстраваннем дзяржаўнай ідэалогіі культуры, падкрэсліваюць міжнародны статус краіны. Дзяржаўныя сімвалы для краіны, якая беражліва захоўвае і шануе сваю гісторыю, цэніць уласныя дасягненні, — гэта найважнейшы палітычны, ідэалагічны і сацыяльна-культурны набытак».**



Прыгадваючы кантэкст 1995 года, калі ў выніку рэферэндуму 14 мая беларусы прагаласавалі за новыя Дзяржаўны сцяг і Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь, Ігар Марзалюк нагадаў, што змена, у першую чаргу сцяга, была выклікана тым, што большасць беларусаў, асабліва сталага пакалення, успрымала чырвона-зялёны сцяг сваім, сцягам беларускай дзяржаўнасці, якая рэальна існуе. «Бела-чырвона-белы сцяг застаўся ў памяці беларусаў нядобрым чынам: старэйшае пакаленне адназначна асацыявала яго са знакам здрады і калабарацыі, — канстатаваў член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. — У людзей наконт гэтага сцяга ўзнікалі дзве сэнсавыя канатацыі: сцяг БНФ і сцяг паліцаяў. Імкненне апеляваць да нечага больш старажытнага ніякага плёну не дало, тым больш што старажытнасці ў гэтым сцягу, у адрозненне ад ранейшага герба, не было. Беларусы галасавалі за чырвона-зялёны сцяг і за змену герба, бо вяртанне да гэтых сімвалаў было вяртаннем і апеляцыяй да той ідэнтычнасці, традыцыі, якую большасць беларусаў лічылі сваёй — рэальнай, роднай».

Доктар гістарычных навук падкрэсліў, што чырвона-зялёны сцяг не з'яўляўся нечым новым. «Упершыню ідэю выкарыстання яго ў якасці нацыянальнага сімвала агучылі прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі, якія ўваходзілі ў літаратурныя аб'яднанні «Узвышша» і «Маладняк», яшчэ ў 1920-х гадах, — расказаў Ігар Марзалюк. — А вось сама ідэя была ўвасоблена ў 1960-х гадах. Самае цікавае, аб тым, што беларускія інтэлектуалы 1920-х гадоў лічылі неабходным выкарыстоўваць зялёны і чырвоны колеры ў якасці нацыянальных фарбаў, пісаў яшчэ ў нацысцкай газеце «Раніца», што выходзіла ў Берліне, такі далёкі ад апалогіі гэтага сцяга чалавек, як беларускі калабарант і літаратуразнаўца Антон Адамовіч».

Па словах Ігара Марзалюка, усе тыя, хто на рэферэндуме 1995 года галасаваў за сацыяльна арыентаваную эканоміку, хацеў узнаўлення эканамічных, знешнепалітычных і саюзніцкіх сувязяў з суседзямі па былым Савецкім Саюзе, быў за інтэграцыю з Расійскай Федэрацыяй, галасавалі і за чырвона-зялёны сцяг. «Тыя ж, хто галасаваў за бела-чырвона-белы, галасаваў і за прынцыпова іншую мадэль беларускай дзяржаўнасці, — заўважыў ён. — Для іх ідэалам была Беларусь, інтэграваная ў паўночнаатлантычныя структуры, у тым ліку Еўрасаюз і НАТА, Беларусь, варожая Расійскай Федэрацыі, і Беларусь, якая рашуча парывала з савецкім мінулым, у якім яна нібыта бачыла толькі цемру, страх і нічога пазітыўнага».

Парламентарый падкрэсліў: сцяг — гэта больш чым проста палотнішча пэўных колераў. «Гэта сімвалічнае дапаўненне найважнейшых фундаментальных прынцыпаў, вобраз сённяшняга і малюнак будучыні на перспектыву, за які галасавалі людзі, — канкрэтызаваў Ігар Марзалюк. — Таму тыя, хто галасаваў за Аляксандра Лукашэнку, успрымаў яго як нацыянальнага лідара, лічыў, што без інтэграцыі і вяртання гандлёвых і эканамічных сувязяў з традыцыйнымі саюзнікамі, народамі і дзяржавамі, з якімі былі разам у Савецкім Саюзе, немагчыма эфектыўнага, годнага і заможнага жыцця, галасавалі за змяненне дзяржаўнай сімволікі. І, як паказала жыццё, яны мелі рацыю. Мы жывём у разы лепш і не ўцягнуты ў агрэсіўныя войны».

Кажучы пра сэнсы і сімвалы сучаснага Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, які па выніках рэферэндуму 14 мая 1995 года прыйшоў на змену герба «Пагоня», Ігар Марзалюк адзначыў, што герб нашай краіны ўяўляе сабой размешчаны ў сярэбраным полі залаты контур Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь, накладзены на залатыя промні ўзыходзячага над зямным шарам сонца. «Уверсе поля знаходзіцца пяціканцовая чырвоная зорка, — дадаў ён. — Герб абрамлены вянком з залатых каласоў, пераплецены справа кветкамі канюшыны, злева — кветкамі лёну. Вянок тройчы перавіты з кожнага боку чырвона-зялёнай стужкай, у сярэдняй частцы якой, у аснове Дзяржаўнага герба, у два радкі напісаны золатам словы — «Рэспубліка Беларусь». Зямны шар — знак таго, што Беларусь успрымае ўсе народы Зямлі як раўнапраўных сяброў і партнёраў. Яднанне Зямлі і Сонца — галоўны знак жыцця. Чырвоная зорка — сімвал чалавека і чалавецтва, знак мужнасці і высокіх намераў. У малюнку герба захаваны асноўныя нацыянальныя і духоўныя каштоўнасці беларусаў: грамадзянская адзінства, праца, любоў да свету. Гэта наш беларускі нацыянальны герб. За ім — плён працы нашых дзядоў і прадзедаў, якія стварылі БССР. Таму мы не саромеемся, а ганарымся пераемнасцю герба Рэспублікі Беларусь з гербам БССР, нашай першай нацыянальнай дзяржавы на савецкай аснове. Мы ганарымся плёнам працы нашых дзядоў і прадзедаў, нашай мужнай беларускай няскоранай нацыяй».

Старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў падкрэсліў, што сцяг, герб і гімн — гэта тры сімвалы, якія існуюць у непарыўным адзінстве, найважнейшыя знакавыя сімвалы. Гімн, па яго словах, таксама з'яўляецца адным з найважнейшых маркераў дзяржаўнай нацыянальнай тоеснасці. «Са старажытнагрэчаскай гімн перакладаецца як «урачыстая песня», — паведаміў дэпутат. — Спачатку — у хвалу багоў, а потым — зямлі і дзяржаўнасці. Першы беларускі гімн — «Багародзіца, дзева, радуйся!» Ён зафіксаваны ў першасным варыянце ў Статуце 1529 года. У аснову гімнаграфіі былі пакладзены творы Кірылы Тураўскага...».

Ігар Марзалюк падзяліўся, што на працягу ўсяго яго дзяцінства Беларускае радыё пачынала і заканчвала свае перадачы з гімнаў БССР і СССР. «Гэтая мелодыка, тэкст успрымаліся як сваё, роднае, як элемент традыцыі навейшай савецкай беларускай сацыялістычнай дзяржаўнасці, невыпадкова ён быў пераняты ў дні сённяшнія, — лічыць гісторык. — Словы нашага велічнага гімна — «Вечна жыві і квітней, Беларусь!» — сведчаць аб неўміручасці, вечнасці нашай вялікай нацыі і краіны».

## «Кожны радок тэксту беларускага гімна зазначае нашы традыцыі, нашы каштоўнасці»

**Паэт, намеснік дырэктара выдавецтва «Мастацкая літаратура» — галоўны рэдактар часопіса «Полымя» Віктар ШНІП** прызнаецца:

— Для мяне, як для паэта, вельмі важна, каб знакавыя для беларусаў рэчы адлюстроўваліся ў паэтычным слове, і каб гэтаму паэтычнаму слову аддавалася ўвага ў грамадстве. Таму лічу вельмі слушным, што 12 красавіка 2023 года Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 105, згодна з якім карэкціраваўся Указ ад 26 сакавіка 1998 года № 157 «Аб дзяржаўных святах, святочных днях і памятных датах у Рэспубліцы Беларусь». Цяпер назва свята замест «Дзень Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь» гучыць як «Дзень Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь». Гэта значыць, што да візуальных сімвалаў нашай дзяржавы на роўных далучаны той, што выказаны музыкай і паэтычным, родным словам.



Мне даводзілася самому працаваць над адказнымі тэкстамі накшталт урачыстай песні для работнікаў культуры, якую мы стваралі ў тандэме з кампазітарам Ігарам Лучанком. Я памятаю, як даводзілася ўзважваць кожнае слова, адшліфоўваць кожнае сугучча, намагацца не страціць сэнс, калі паляпшаеш меладычнасць. Магу толькі ўявіць, якіх намаганняў каштавала праца над такім адказным тэкстам, як Дзяржаўны гімн, паважанаму паэту Уладзіміру Карызну. Зрэшты, ён сам не раз пра гэта казаў, як кожнае слова давялося прапускаць праз сэрца. Лічу, што праца ў яго атрымалася, як і належала, знакавая. Бо паэту давялося ж арыентавацца і на папярэднікаў, на словы таго ж Міхася Клімковіча, аўтара тэксту гімна БССР, і на рэаліі сучаснай Беларусі, і думаць пра тое, як гэтыя словы будуць гучаць для нашчадкаў.

Гімн адразу дае ключ да разумення ментальнасці беларускага народа, яго духоўнага аблічча: «Мы — беларусы, мірныя людзі». Далёка не кожны дзяржаўны гімн у свеце ўтрымлівае такую дэкларацыю міралюбнасці. Я, зразумела, не ведаю гімнаў усіх краін свету, каб параўноўваць, але тыя пераклады, што мне давялося пачуць, часам зусім не мірныя, хутчэй наадварот... Важна, што кожны радок беларускага гімна зазначае нашы традыцыі, нашы каштоўнасці: «Сэрцам адданыя роднай зямлі, шчыра сябруем, сілы гартуем мы ў працавітай, вольнай сям'і». Ёсць тут і любоў да Радзімы, і схільнасць да сяброўства і супольнай стваральнай працы — згадаць хоць бы старадаўні беларускі звычай талакі. Ёсць у нашым гімне і згадкі пра трагічнае мінулае і подзвіг беларускага народа, які «бараніў родны парог»... Цяпер цяжка ўявіць, што цягам стольких гадоў, з 1995-га да 2002 года, беларускі Дзяржаўны гімн выконваўся без слоў — рэаліі змяніліся, Беларусь стала незалежнай краінай, а тэксту, які б годна адлюстраваў гэтыя змены і задаволіў бы ўсіх, не знаходзілася. Мабыць, не ўсе ўсвядомілі важнасць таго моманту, калі гімн набыў голас! Мне радасна, калі ва ўрачыстых выпадках пад музыку Нестара Сакалоўскага гучыць роднае беларускае слова — нагадваючы ўсім, што яно мае знакавую каштоўнасць для нашай дзяржавы.

# НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

## «Мы — актыўныя ўдзельнікі свята»

### Дырэктар завода ўдастоены права ўзняць сцяг на раённым святкаванні

**Права ўзняць Дзяржаўны сцяг на ўрачыстым мерапрыемстве, прысвечаным Дню Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь у Пружанах сёлета нададзена дырэктару Пружанскага льнозавода Мікалаю ЖОГАЛУ.**


Фота sb.by.

Такога гонару кіраўнік прадпрыемства ўдастоены найперш таму, што па выніках работы ў 2023 годзе завод занесены на Рэспубліканскую дошку Гонару.

— Той факт, што ўказам Прэзідэнта завод занесены на Рэспубліканскую дошку Гонару, стаў галоўным падарункам калектыву на 50-гадовы юбілей прадпрыемства, — гаворыць Мікалай Жогал, які дарэчы, узначальвае завод без малога сорак гадоў. — Сёння наш завод з'яўляецца вядучым прадпрыемствам ільнаводчай галіны ў Беларусі. Мы ўзялі на ўзбраенне самыя сучасныя тэхналогіі, з дапамогай якіх запусцілі поўны цыкл атрымання льновалакна. Адзін з найлепшых узораў абсталявання ўстанавілі ў вытворчым цэху, які ўзвялі 13 гадоў таму, а яшчэ набылі высокаэфектыўную тэхніку для палёў. Пералічанае стала магчымым дзякуючы падтрымцы дзяржавы.

— Цяпер Пружанскі льнозавод — адзін з самых вялікіх у краіне, — працягвае Мікалай Сцяпанавіч. — Надзвычай складаную ў сэнсе земляробчай справы культуру мы навучыліся вырошчваць і апрацоўваць на ўзроўні сусветных стандартаў. І ўжо не без гонару гаворым пра ўласную школу механізатараў.

Сёння завод стаў адным з важнейшых пастаўшчыкоў сыравіны на Аршанскі льнокамбінат. Летась у Оршу адправілі больш як тысячу тон доўгага валакна, гэта пятая частка сыравіны, якая паступіла на буйнейшы ў свеце льнокамбінат. На гэты год планы не меншыя. Пасяўныя плошчы лёну складаюць амаль тры тысячы гектараў. Завадчане сталі паспяховымі земляробамі. У свой час быў створаны магутны механізаваны атрад, з дапамогай якога вырошчваецца сыравіна для работы завода.

— Самае важнае на любым прадпрыемстве — гэта людзі, — працягвае аповед дырэктар. — Машыны можна набыць, укараніць тэхналогіі, а калектыў трэба вырошчваць гадамі і дзесяцігоддзямі. Вось як у нас: людзі, якія прайшлі ў свой час праз цяжкасці, склалі касцяк калектыву, потым сталі заснавальнікамі ўласнай школы льнаводства. За гады мы вырасцілі ў калектыве прафесіяналаў, якімі варта ганарыцца. Гэта механізатары, загадчыкі лабараторыі, здымшчыкі, сарціроўшчыкі валакна, слесары, інжынеры, бухгалтары, эканамісты. З імі любыя задачы вырашальныя. А яшчэ нашы людзі адрозніваюцца актыўнай грамадзянскай пазіцыяй. Члены калектыву ўдзельнічаюць ва ўсіх раённых мерапрыемствах патрыятычнага кірунку. Мы ганарымся тым, што прадпрыемства занесена на Рэспубліканскую дошку Гонару, якая знаходзіцца на плошчы Дзяржаўнага сцяга, і ў гэты раз будзем актыўнымі ўдзельнікамі свята з нагоды Дня дзяржаўных сімвалаў.

## «Калі гучыць гімн і падымаецца сцяг — слёзы наварочваюцца»



**Асаблівае значэнне дзяржаўныя сімвалы маюць для тых, хто дэманструе іх на ўвесь свет, — для спартсменаў. Выступаць пад нацыянальным сцягам — вялікая адказнасць, бо гэта азначае выступаць за ўсю краіну. Слухаць родны гімн — найвялікшая радасць, бо гімн гучыць толькі ў гонар чэмпіёна. Пра ролю дзяржаўных сімвалаў у жыцці спартсмена расказала Кацярына КАРСТЭН, у чый гонар беларускі гімн двойчы гучаў на Алімпійскіх гульнях:**

«Вельмі адказна выступаць на Алімпійскіх гульнях, на чэмпіянатах свету, калі на грудзях у цябе герб, на лодцы — сцяг. Але настолькі ж прыемна і ганарова, стоячы на п'едэстале слухаць свой гімн, спяваць яго і бачыць, як у неба паднімаецца родны сцяг. Пачуццё гонару перапаўняе ў такія моманты. Пачуццё гонару за сваю краіну, за сябе, за тое, што ты зрабіў усё магчымае, каб людзі з самых розных краін свету пачулі беларускі гімн і ўбачылі беларускі сцяг. Эмоцыі зашкальваюць у такія моманты. Гэта вельмі ўрачыста, вельмі эмацыянальна — не параўнаць ні з чым. Пасля асабліва цяжкіх стартаў нярэдка наварочваюцца слёзы, яны самі цякуць. Заўсёды хочацца перамагаць і слухаць свой гімн, але, стоячы на п'едэстале, бачыць свой сцяг злева ці справа, не менш ганарова і ўрачыста. Усяго некалькі хвілін, якія запамінаюцца на ўсё жыццё і матывуюць і далей плённа працаваць на трэніроўках, выкладваючыся на максімум.

Спартсмены з самага пачатку сваёй кар'еры ведаюць і рыхтуюцца да таго, што будуць бараніць сцяг сваёй краіны. Сёння ў многіх спартсменаў забралі магчымасць выступаць пад сваім сцягам. Але людзі прысвячаюць спорту ўсё сваё жыццё, у некаторых магчымасць выступіць на Алімпійскіх гульнях бывае раз у жыцці, таму нельга іх гэтага пазбаўляць. А сцяг мы дома разгорнем, і гімн у іх гонар уключым, і гэта будзе нават больш урачыста, чым недзе за мяжой».

## «Паказчыкі нашай самасвядомасці»

**Штогод у другую нядзелю мая ў Беларусі адзначаецца Дзень Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна. Менавіта са школьнага парога маленькія беларусы пачынаюць знаёмства з сімваламі сваёй краіны, іх сутнасцю і значнасцю. Аб тым, як выхаваць дастойных грамадзян сваёй краіны, расказала настаўнік пачатковых класаў Ноўкінскай сярэдняй школы Віцебскага раёна Людміла ПРЫХОДЗЬКА.**


Фота Аляксандры ГВОЗДЗЕВАЙ.

***— Людміла Мікалаеўна, наколькі дзяржаўныя сімвалы з'яўляюцца для беларусаў неад'емнай часткай нацыянальнай самасвядомасці?***

— Лічу, што сімволіка — гэта самае дарагое, што ёсць у кожнага народа. Любы чалавек, які з'яўляецца грамадзянінам сваёй краіны, павінен цаніць сваю дзяржаву, берагчы і паважаць яе сімвалы. Беларусы перажылі наступствы шматлікіх войнаў, узнялі з руін гаспадаркі і вывелі краіну на высокі ўзровень, пабудавалі сваю атамную станцыю і нават паляцелі ў космас пад уласным сцягам. Гэта, бадай, і ёсць паказчык нашай самасвядомасці, адзінства і моцы.

***— Ставіцца паважліва да дзяржаўных сімвалаў Беларусі — абавязак толькі нашых суайчыннікаў?***

— Не. Кожны чалавек, які прыехаў у госці ў Сінявокую, абраў яе для сабе як пастаяннае месца жыхарства або быў вымушаны пакінуць сваю радзіму і знайшоў прытулак на нашай гасціннай зямлі, павінен паважаць наш сцяг, герб і гімн. І наадварот, калі мы апынемся ў брацкай Расіі ці ў якой іншай краіне, павінны весці сябе дастойна. Гэта правільнае выхаванне.

***— Цяпер вы ведзяце да ведаў 21 другакласніка. Калі вашы навучэнцы пачалі знаёмства з дзяржаўнай сімволікай і ў якім фармаце?***

— Класічна знаёмства першакласнікаў з сімваламі пачынаецца на першым уроку 1 верасня. Аднак канкрэтна ў нашай установе адукацыі працэ «суботняя школа», дзе дзеткі праходзяць падрыхтоўку перад паступленнем у першы клас. Ужо на гэтым этапе малыя знаёмяцца з гімнам, сцягам і гербам. Дарэчы, элементы герба імкнуся тлумачыць пераважна на беларускай мове. Так і атрымліваецца, што блакітныя кветачкі лёну — «беларуская золата» — гэта наш брэнд і гонар. У замежных гасцей вырабы з гэтай тканіны карыстаюцца вялікай папулярнасцю, бо матэрыял практычны і якасны. Каношына і спелыя каласы — сімвал дабрабыту і дастатку, моцнага аграпрамысловага комплексу. І, вядома, зямны шар — жаданне жыць у міры і згодзе з усімі краінамі свету.

***— Што, на ваш погляд, з'яўляецца важнейшай асаблівасцю беларускага сцяга?***

— Арнамент. Гэта надзвычай рэдкая з'ява на сцягах дзяржаў свету. Больш таго, Беларусь адзіная са славянскіх краін мае такую ключавую сімволіку на сваім сцягу. Арнамент указвае на старажытныя карані беларусаў, на традыцыі добрасумленнай працы і строгага парадку. Гэта і ёсць нашы карані, адтуль і пачаўся наш род. Трэба дадаць, што выкарыстаныя чырвоны і зялёны колеры падабраны вельмі арганічна, жыва.

Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также возместить Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания протокола о результатах аукциона, оплатить приобретаемое имущество Продавцу: в размере 30 % от цены продажи имущества в течение **15 (пятнадцати) календарных дней** с момента заключения договора, 70 % от цены продажи ежемесячно равными долями в течение календарного года с момента заключения договора с индексацией платежей в соответствии с постановлением государственного комитета по имуществу Республике Беларусь от 22.10.2019 № 14 «О порядке расчета платежей при рассрочке оплаты стоимости государственного имущества».

Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 25.07.2023 г. № 141, от 13.01.2024 г. № 9, от 16.03.2024 г. № 54. Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальных сайтах Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы», Гомельского областного исполнительного комитета – gomel-region.by, Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – www.gki.gov.by/ в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: тел.: 8 (0232) 23-23-56, 8 (044) 599-18-16.**

# ПАТРЫЯТЫЗМ ЯК ДУШЭЎНАЯ ПАТРЭБА



Дачка Любові Родавай Клара КЛІМАВА паказала ўзнагароды знакамітай жыхаркі Уваравіч.

## Пісала лісты начамі

Сапраўдны патрыятызм — не ў словах, а ў жыццёвай пазіцці, штодзённых справах, учынках. Гэта не абавязак, а душэўная патрэба, упэўнена Марына Гулевіч. З нараджэння яна перакаралася ў гэтым на прыкладзе сваёй бабулі і бацькоў.

— Бабуля Любоў Мацвееўна нарадзілася ў 1946 годзе ў Башкірыі. Туды яе сям'я з Гомеля трапіла ў эвакуацыю. Калі бабулі было тры гады, яны пераехалі ва Уваравічы — на той момант цэнтр Уваравіцкага раёна. Вайна закранула яе сям'ю самым непасрэдным чынам, і гэтая тэма бабулю асабліва хвалявала. На працягу ўсяго жыцця яна збірала матэрыялы пра ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, — расказвае Марына.

Згадвае, як бабуля магла начамі не спаць, у любы вольны час працавала з архівамі, вяла перапіску са сваякамі загінулых, зніклых без вестак франтавікоў, партызан, падпольшчыкаў.

— Яна казала, што, каб знайсці магілу аднаго салдата, даводзіцца зрабіць масу званкоў, запытаў, напісаць вялізную колькасць лістоў у розныя інстанцыі. Трэба памятаць, што ў той час не было электронных пошукавых сістэм аб удзельніках Вялікай Айчыннай вайны, — дадае суразмоўніца.

## Шукала любую «нітачку»

А пачалося ўсё з таго, што аднойчы да Любові Мацвееўны звярнулася яе суседка — шукала хоць нейкую інфармацыю аб сваім сваякуфрантавіку. Марыніна бабуля ўзялася дапамагчы. Немагчыма нават злічыць, колькі матэрыялаў, гісторый соцень людзей, якія ваявалі, прайшлі фашысцкі палон ці прапалі без вестак, яна прапусціла праз сваё сэрца. Усё гэта адбывалася на вачах дачкі Любові Мацвееўны, мамы Марыны Гулевіч — Клары Клімавай. Клара Аляксандраўна — настаўніца пачатковых класаў Уваравіцкай сярэдняй школы Буда-Кашалёўскага раёна. Усё жыццё яна аддала працы ў роднай школе.

— Пасля школы мама паступіла на факультэт замежных моў, хацела быць настаўніцай англійскай. Але сяброўкі яе не паступілі, і яна проста за кампанію забрала дакументы і не пайшла вучыцца, — расказвае аб сваёй маці Клара Аляксандраўна. — У 1960-х гадах мама працавала піянерважатай у нашай школе. З сяброўкай удваіх арганізавалі першы чырвоны куток, які потым стаў музеем імя Леніна. У ім быў раздзел, прысвечаны вайне і ўкладу жыхароў Уваравіч у справу Вялікай Перамогі.

## Прыроджаны пошукавік

Незвычайныя здольнасці і прага ў пошукавай працы Любові Родавай адкрыліся ў 1983 годзе. Ветэран Вялікай Айчыннай, ваенрук Алег Сяргееў і Любоў Мацвееўна (тады ўжо дырэктар Уваравіцкага гарадскога Дома культуры) узяліся да 40-годдзя Перамогі правесці сустрэчу ветэранаў 98-га авіяцыйнага палка, які ў гады вайны дыслацыраваўся ва Уваравічах. Пасля, калі выйшла на пенсію, Любоў Родава ўвогуле ўсю сябе прысвяціла пошукавай рабоце, увекавечанню памяці аб героях вайны — ураджэнцах Уваравіч і тых, хто загінуў падчас вызвалення населенага пункта і найбліжэйшых вёсак. Любоў Родава сабрала звесткі, фатаграфіі і зрабіла ў роднай школе стэнд, прысвечаны ветэранам-настаўнікам Уваравіцкай школы. У 2007 годзе на будынку ўстановы адукацыі намаганнямі Любові Мацвееўны была адкрыта мемарыяльная дошка з імёнамі выпускнікоў школы, якія загінулі ў мірны час пры выкананні воінскага абавязку.

— Яшчэ ў канцы 1990-х пры пераездзе Уваравіцкай сярэдняй школы ў новы будынак большая частка экспанатаў для музея, сабраных мамай у 60-х гадах, бясследна знікла. Яна вельмі перажывала, — дзеліцца Клара Аляксандраўна. — Але мама не здалася. З 2007 года пачала збіраць новую калекцыю. Практычна кожная сям'я дапамагла ёй аднавіць экспазіцыю. Мама сабрала дакументы, фатаграфіі, асабістыя рэчы ўдзельнікаў вайны, кнігі былых уваравіцкіх партызан, звесткі пра героя падполля Івана Харытонавіча Казлова, чыім імем названа адна з вуліц аграгарадка.

Пакуль працяглы час не было памяшкання для музея, усе экспанаты захоўваліся ў Любові Мацвееўны дома. Яна не ленавалася і кожны раз рыхтавала выязныя экспазіцыі на ўсіх мерапрыемствах, якія праходзілі ў аграгарадку.

— Дзякуючы яе намаганням на базе нашай школы быў адкрыты музейны пакой «Мы гэтай памяці верныя», дзе захоўваюцца ўнікальныя экспанаты часоў Вялікай Айчыннай вайны: узнагароды, дакументы, лісты, фатаграфіі і асабістыя рэчы салдат. У музеі ёсць сапраўдная рэліквія — кніга ўліку партызанскага атрада імя Шчорса, які біў ворага на Гомельшчыне, — дадае дачка Любові Мацвееўны Клара Клімава.

Сёння дапамагаюць праводзіць экскурсіі ў музеі ўжо вучні Клары Аляксандраўны. Сярод іх — першакласнік Ваня Сапуноў — праўнук Любові Мацвееўны. Выходзіць, не справу па захаванні памяці аб героях Вялікай Айчыннай працягвае ўжо чацвёртае пакаленне яе сям'і.

## «Не спыняла пошук ні на дзень»

— Доўгія гады бабуля ішла да ўвасаблення ў жыццё вельмі важнай справы — увекавечанне імён герояў Вялікай Айчыннай вайны — мемнавіта ўраджэнцаў Уваравіч і нанясення іх прозвішчаў на мемарыяле брацкага пахавання ў аграгарадку.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



Следчы па асабліва важных справах следчага ўпраўлення УСК па Гомельскай вобласці Марына ГУЛЕВІЧ разам з дачкой Аняй на ўрачыстым шэсці ў гонар Вялікай Перамогі.




Праводзіць экскурсіі дапамагае праўнук Любові Родавай — першакласнік Ваня САПУНОЎ.



У музейным пакоі «Мы гэтай памяці верныя» захоўваюцца ўзнагароды, дакументы, лісты, фатаграфіі і асабістыя рэчы герояў-франтавікоў.

У Буда-Кашалёўскім райваенкамаце бабулі дазволілі працаваць з архіўнымі матэрыяламі. Яна выпісала кожнае прозвішча загінулага ўраджэнца Уваравіч, зверыла гэтыя звесткі з Кнігай Памяці Буда-Кашалёўскага раёна і папоўніла існуючы спіс 22 прозвішчамі. На гэтым яна не спынілася, размясціла ва Уваравічах аб'яву з просьбай звяртацца па тэлефонах у ваенкамат ці да яе напрамую: паступіла ад мясцовых шмат просьбаў адшукаць іх сваякоў. За восем месяцаў актыўнага пошуку было ўстаноўлена 118 страчаных імёнаў. Дакументы па запытах паступалі з цэнтральнага архіва Міністэрства абароны Расіі, Ленінградскага Міністэрства абароны, усіх абласных і раённых ваенкаматаў Беларусі. Не спыняла пошук ні на дзень, — аб каласальнай праведзенай рабоце бабулі, у якой ёй дапамагала і Клара Аляксандраўна, расказвае Марына Гулевіч.

Намаганнямі Любові Родавай на 12 мармуровых плітах мемарыяльнага комплексу ва Уваравічах увекавечаны ў агульнай складанасці 401 чалавек. Па ўзгадненні з Буда-Кашалёўскім райсаветам быў адобраны праект, распрацаваны асабіста Любоўю Родавай, — размяшчэнне пліт з імёнамі герояў у форме коласа, што азначае жыццё, аддадзенае за родную зямлю. У 2017 годзе мемарыяльны комплекс ва Уваравічах дапоўнілі гарматы «Рута», якія былі ўстаноўлены толькі дзякуючы неўтаймаванасці і неабыякавасці да справы Любові Родавай. Гэта сапраўды асаблівае месца памяці для ўсіх жыхароў Уваравіч.

Велізарны ўклад Любові Родавай не застаўся незаўважаным. Яе сям'я беражліва захоўвае дзве ганаровыя граматы і падзяку Буда-Кашалёўскага раённага Савета дэпутатаў за пошукавую работу, адраджэнне побыту і традыцый Беларусі; Ганаровую грамату Буда-Кашалёўскага райваенкамата за пошукавую работу і ўвекавечанне загінулых жыхароў г. п. Уваравічы, шматлікія дыпломы і граматы, падзякі.

## Знялася ў кіно

— Бабуля дапамагла і сама знялася ў фільме кінастудыі «Беларусьфільм» «Афганістан. Памяць». Прымала ўдзел у фільме пра халакост «Па слядах страчанай памяці», знятым супрацоўнікамі музея «Яд Вашэм» з Ізраіля. Неверагодна, але пасля наведвання Ізраіля ёй удалося ўстанавіць яшчэ некалькі страчаных імёнаў сваіх загінулых землякоў, — тлумачыць Марына Гулевіч. — Бабуля адвезла туды дыск з фільмам аб адкрыцці мемарыяла ва Уваравічах, і былыя нашы жыхары, якія цяпер жывуць у Ізраілі, не знайшоўшы ў спісах сваіх родных, выслалі ёй дакументы з іх імёнамі. Па просьбе рэжысёра Барыса Мафцыра бабуля зрабіла выбарку прозвішчаў яўрэяў — загінулых ураджэнцаў Гомельшчыны. Гэтыя звесткі былі перададзены ў музей. Над фільмам працавала ізраільскі валанцёр Эліза Фрэнкель, якая доўгі час не магла знайсці сваіх родных. Дзякуючы гэтым спісам яна даведалася, што сваякі расстраляныя і пахаваныя ў брацкай магіле ва Уваравічах. Яна неаднаразова прыязджала, каб ушанаваць іх памяць, — дадае Марына.

За актыўны ўдзел у жыцці раёна імя Любові Родавай унесена ў кнігу «Хто ёсць хто ў Рэспубліцы Беларусь» у выпуск, прысвечаны 70-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

— Яе не стала 1 кастрычніка 2021 года. Доўгі час не магла змірыцца з гэтай стратай, — не хавае эмоцый Марына Гулевіч. — Калі маленькай была, потым падлеткам, сапраўды сварылася, спрачалася з ёю: на дыскатэку хачу, а бабуля просіць спісы загінулых на камп'ютары набіраць ці лісты франтавікоў. Калі пасталела, вядома, зразумела, якую патрэбную і важную працу яна рабіла. Дапамагалі ёй і мае бацькі. Цяпер я сама захварэла на пошукавую работу.

У 2022 годзе па ініцыятыве УСК па Гомельскай вобласці сярод супрацоўнікаў структурных і тэрытарыяльных падраздзяленняў УСК быў праведзены конкурс на найлепшую работу аб вызваленні населеных пунктаў — малой радзімы супрацоўнікаў — у час Вялікай Айчыннай вайны. У конкурсе перамог надзвычай грунтоўны творчы праект якраз Марыны Гулевіч.

— Калі вырашыла расказаць пра вызваленне родных Уваравіч, зразумела, наколькі вялікую работу трэба правесці. У Гомельскай вобласці ёсць такія буйныя населеныя пункты, гісторыі вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў якіх прысвечаны цэлыя музеі, пра іх вельмі шмат інфармацыі. Уваравічы — маленькі пункт на карце, асобна Уваравіцкага раёна даўно няма. Але я вельмі хацела зрабіць такую даследчую работу, якая была б цікавая і пазнавальная, — распавяла следчы па асабліва важных справах следчага ўпраўлення УСК па Гомельскай вобласці.

Марыне Гулевіч спатрэбілася на работу амаль чатыры месяцы. Разам з мамай пасля конкурсу яны не дапрацоўвалі, каб праект можна было выкарыстоўваць і ў музейнай экспазіцыі Уваравіцкай сярэдняй школы.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**

Супрацоўніцтва

# МАЛАДОСЦЬ ЯК ЗАДАЧА ДЛЯ ХІРУРГА

## Пластыка твару стане тэмай I Беларуска-Бразільскага кангрэса пластычнай хірургіі і касметалогіі «Face to Face»

**16—17 мая ў беларускай сталіцы збяруцца вядучыя спецыялісты ў галіне пластычнай хірургіі з Бразіліі (адной з дзяржаў — сусветных лідараў у гэтым кірунку медыцыны), Расіі, Турцыі, Казахстана, Азербайджана, іншых краін, а таксама найлепшыя беларускія пластычныя хірургі. У Мінску пройдзе I Беларуска-Бразільскі кангрэс пластычнай хірургіі і касметалогіі «Face to Face» і II Нацыянальны кангрэс «Пластычная хірургія і касметалогія».**

Арганізатарамі міжнароднага прафесійнага форуму выступілі Таварыства пластычнай, рэканструктыўнай і эстэтычнай хірургіі (Рэспубліка Беларусь), Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў аховы здароўя БДМУ, Міністэрства аховы здароўя нашай краіны і Бразільскае таварыства пластычнай хірургіі пры актыўным удзеле Пасольства Бразіліі ў Беларусі.

### НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

«Ідэя кангрэса ўзнікла як вынік імкнення зблізіць навуковыя і акадэмічныя колы Бразіліі і Беларусі, паглыбіць наша супрацоўніцтва, — сказаў напярэдадні кангрэса **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Федэратыўнай Рэспублікі Бразілія ў Рэспубліцы Беларусь Бернард Жорг Леапольд дэ Гарсія КЛІНГЛ**. — У Бразіліі праводзіцца



Фота Лізаветы ГОЛАД.

найбольшая колькасць пластычных аперацый у свеце: напрыклад, летась было праведзена 55 млн пластычных аперацый».

Узровень медыцыны ў Беларусі вельмі высокі, падкрэсліў пасол:

— Беларускія медыкі валодаюць унікальнай кваліфікацыяй, таму ідэя была ў тым, каб менавіта праз Беларусь распавесці больш падрабязна пра бразільскія дасягненні ў галіне пластычнай хірургіі.

Галоўная тэма кангрэса вызначана як пластычная хірургія твару. У першую чаргу гаворка ідзе аб амаладжальнай хірургіі.

— Хірургія твару — адна з найбольш запатрабаваных паслуг. Размова на кангрэсе будзе ісці таксама аб пластыцы носа і шыі, — сказаў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Федэратыўнай Рэспублікі Бразілії ў Рэспубліцы Беларусь. — Гэта першы кангрэс, і, мы спадзяёмся, ён пакладзе паспяховы пачатак шэрагу наступных кангрэсаў. Разлічваем, што мерапрыемства паслужыць развіццю адносін паміж Беларуссю і Бразіліяй, беларуска-бразільскіх сувязяў у галіне медыцыны. Напрыклад, пластычная хірургія садзейнічае развіццю хіміка-біялагічных даследаванняў, прагрэсу ў гэтай навуковай сферы. Хачу падкрэсліць: гэты кангрэс — мерапрыемства шматбаковае, ён мае і навуковы, і эканамічны складнікі. У нас ёсць магчымасць запрасіць на яго бразільскія прадпрыемствы, каб прадставіць медыцынскую прадукцыю, пазнаёміцца з магчымымі партнёрамі.

Беларусь і Бразілія прадаўжаюць супрацоўнічаць у розных сферах, дадаў ён.

— У прыватнасці, нядаўна падпісаны пагадненні аб супрацоўніцтве паміж найбуйнейшым бразільскім федэральным універсітэтам і трыма ўніверсітэтамі Мінска. Сярод іх ёсць дамоўленасць аб супрацоўніцтве ў галіне медыцыны — камп'ютарныя тэхналогіі ў развіцці медыцыны. Што да супрацоўніцтва ў сферы адукацыі, Пасольства Федэратыўнай Рэспублікі Бразілія ў Рэспубліцы Беларусь адправіла чацвярых беларускіх студэнтаў для навучання ў Бразілію. А ў пачатку года было дасягнута пагадненне аб правядзенні сустрэчы па эканамічных кансультацыях у Бразіліі, — сказаў пасол.

Кангрэс пашырыць узаемадзеянне і створыць новыя магчымасці для навуковага абмену ў галіне пластычнай хірургіі і касметалогіі, а таксама рэканструктыўнай хірургіі з прычыны траўм, калецтваў і анкалагічных аперацый. Кангрэс намеціць перспектывы для рэгулярнага абмену ведамі і вопытам паміж спецыялістамі з нашай краіны і Бразіліі, пашырыць магчымасці беларускай пластычнай хірургіі праз прымяненне сучасных падыходаў і аўтарскіх рашэнняў бразільскіх калег беларускіх хірургаў, падкрэсліваюць арганізатары. З часам беларуская сталіца сфарміруе імідж аднаго з цэнтраў пластычнай хірургіі і касметалогіі СНД.

### КАЛІ ЧАС НЕ ЎЛАДНЫ

Удзельнікаў кангрэса чакае насычаная праграма. З лекцыямі і дакладамі анлайн і афлайн выступяць прызнаныя спецыялісты ў галіне амаладжэння твару, рынапластыкі, іншых кірункаў пластычнай хірургіі. Сярод іх — Валнэй Пітомба, кіраўнік Бразільскага таварыства пластычнай хірургіі і сапраўдны член найбуйнейшых міжнародных таварыстваў пластычнай хірургіі. Ён будзе ўдзельнічаць у кангрэсе па відэасувязі. Спецыялізацыя доктара Пітомба — рынапластыка (паляпшэнне формы носа, ухіленне прыроджаных ці набытых недасканаласцяў), і на яго рахунку — 40 гадоў практыкі і больш за 10 тысяч аперацый. Сярод гасцей беларускай сталіцы будуць Марсэла Радрыгес да Кунья Араужо,



кіраўнік Аддзела хірургіі твару Бразільскага таварыства пластычнай хірургіі, Ліжыя Калучы, член Бразільскага таварыства дэрматолагаў і Бразільскага таварыства дэрматалагічнай хірургіі, Інгрыд Люкман, член Бразільскага таварыства пластычнай хірургіі.

— Такое мерапрыемства ўпершыню праходзіць на тэрыторыі постсавецкай прасторы, — падкрэсліла **дацэнт кафедры пластычнай хірургіі і камбустыялогіі БелМАПА, сапраўдны член Міжнароднага таварыства эстэтычнай пластычнай хірургіі (ISAPS), член Таварыства пластычнай, рэканструктыўнай і эстэтычнай хірургіі (Рэспубліка Беларусь) Дзіяна ПЯТРОВА**. — Я ўдзячная бразільскім калегам за тое, што яны падтрымалі наш праект і падзяляцца сваімі ведамі і вопытам з беларускімі ўрачамі. У кангрэсе таксама прымуць удзел калегі з Турцыі, Расіі, іншых краін. Гэта добрая магчымасць для нашых спецыялістаў пашырыць свае веды. Кангрэс дазволіць атрымаць інфармацыю пра новыя тэндэнцыі і сучасныя метадыкі, якія папулярныя ў Бразіліі і свеце.

Беларускім пластычным хірургам таксама ёсць што прадставіць калегам на міжнародным прафесійным форуме, расказала Дзіяна Пятрова:

— Некалькі месяцаў таму супрацоўнікі Цэнтра транспланталогіі правялі аперацыю па аднаўленні цэнтральнай часткі твару і носа. Аб гэтым на кангрэсе будзе зроблены даклад. Гэта добры вынік, якім можна ганарыцца.

Але, гаворачы аб пластычнай хірургіі, у першую чаргу мы маем на ўвазе менавіта яе эстэтычную функцыю. У гэтай якасці ў апошнія дзесяцігоддзі пластыка стала неверагодна запатрабаванай галіной медыцыны: магчымасць «сцерці выпадковыя рысы» і «намаляваць» шэдэўр або падмануць час пры дапамозе скальпеля хірурга бударажыць розумы і прадстаўніц прыгожага, ды нават прадстаўнікоў моцнага полу.



— Усё, што датычыцца прыгажосці і маладосці, з кожным днём набірае абароты, — распавяла Дзіяна Пятрова. — Не сакрэт, што ў Беларусі жанчын нашмат больш, чым мужчын, і без працы мы не застаёмся. Хаця сёння і многія мужчыны хочуць добра выглядаць. Каб мець поспех, трэба быць маладым, прыгожым і, вядома ж, здаровым. Не будзем забываць, што гэта ўсё ж медыцынскі кірунак, а не толькі прыгажосць.

Амаладжэнне — галоўны запыт, з якім прыходзяць да пластычных хірургаў ва ўсім свеце. Зрэшты, сёння ўстаноўка трансфармавалася: нашы сучаснікі (хоць, вядома, у першую чаргу — сучасніцы) хочуць быць прыгожымі ў любым узросце, не хаваючы яго і застаючыся сабой. Першы прынцып — вечная маладосць — родам з 1990-х, эпохі анарэксічных мадэляў, калі на світанку бурнага развіцця пластычнай хірургіі існаваў свайго роду «стандарт прыгажосці»: усе жадалі выглядаць аднолькава, як Барбі, што сыходзяць з канвеера. У трэцім тысячагоддзі, на хвалі моды на здаровы лад жыцця і бодзі-пазітыў, ухваляецца індывідуальнасць, уласная непаўторная прыгажосць — і гэты новы запыт да пластычных хірургаў ускладняе іх задачу, ператвараючы з рамеснікаў у творцаў. Бо, звяртаючыся да іх, пацыент спадзяецца стаць найлепшай версіяй сябе.

### «ПЛАСТЫКА ПАДОБНАЯ ДА ФЭШН-ІНДУСТРЫІ»

Цяпер у свеце самыя запатрабаваныя пластычныя аперацыі (і наша краіна тут не выключэнне) — гэта блефаропластыка (змена формы века), рынапластыка (змена формы носа), а таксама падцяжкі твару — адзіны на сёння падыход, які дае стабільнае амаладжэнне. Дастаткова і іншых, менш траўматычных методык, але пакуль што яны — не альтэрнатыва хірургіі. Таксама запатрабаваны ліпасакцыя (вывядзенне тлушчавай тканкі з арганізма) і мамапластыка (устаноўка імплантаў грудзей).

— Усё залежыць ад узросту пацыента, — адзначае Дзіяна Пятрова. — Для катэгорыі 40+ найбольш часты запыт — амаладжальная хірургія твару: блефаропластыка, падцяжкі, а таксама ін'екцыйныя методыкі. Што да маладых дзяўчат, то найбольш запатрабаваны аперацыі па стварэнні прыгожай формы грудзей.

Свет пластычнай хірургіі ў нечым падобны да фэшн-індустрыі, кажа ўрач:

— Пастаянна з'яўляюцца новыя методыкі і новыя тэндэнцыі. Пяць гадоў таму было модна адно размяшчэнне броваў, цяпер — іншае. Гэта датычыцца і разрэзу вачэй, і формы вуснаў. Але набірае папулярнасць тэндэнцыя натуральнай прыгажосці: чалавек хоча захаваць сваю індывідуальнасць, але пры гэтым стаць прыгожым і маладым.

Мода модай, але, пераступаючы парог кабінета эстэтычнай хірургіі, чалавек павінен сапраўды ведаць, што менавіта ён жадае зрабіць і які вынік атрымаць. Сучасная пластычная хірургія можа шмат. Але проста «зрабіце мяне прыгожай» — гэта так не працуе. Дарэчы, пластычны хірург мае права адмовіць у правядзенні аперацыі. І калі чалавек «сам не ведае, чаго хоча» — гэта адназначная нагода для адмовы: такі пацыент будзе расчараваны пры найлепшым тэхнічным выкананні работы (а «вярніце як было» ўжо не атрымаецца). Яшчэ адна нагода для адмовы — калі чалавека штурхае «пад нож» устойлівая і застарэлая нелюбоў да сябе. Крайняя яе ступень — дысмарфафобія (на гэта псіхічнае адхіленне пакутуе каля 4 % людзей на нашай планеце). Такому чалавеку ўсё ў сабе не падабаецца, і ён (калі не сустракае адмовы) робіць адну аперацыю за адной і ўвесь час не задаволены вынікам.

### ХІРУРГ ЛЁС НЕ ПАМЯНЯЕ

Ёсць нямала крытэрыяў прыгажосці. Напрыклад, залатое сячэнне. Але, на жаль, прыгажосць не вылічыць у міліметрах. Важная якасць добрага пластычнага хірурга (акрамя глыбокіх медыцынскіх ведаў) — здольнасць убачыць, што будзе прыгожа менавіта для гэтага чалавека. Таму так важны міжнародны абмен вопытам: бо кожная краіна з высокім развіццём гэтай сферы медыцыны мае «найвышэйшую кваліфікацыю» ў нечым сваім.

Аб пластычнай хірургіі — дакладней, аб яе мэтазгоднасці па эстэтычных, а не медыцынскіх паказаннях (калі гаворка не ідзе аб ухіленні наступстваў калецтваў) — можна спрачацца. І многія спрачаюцца. Але часам, гавораць пластычныя хірургі, чалавеку сапраўды неабходна змяніць нешта ў сваёй знешнасці, каб дасягнуць жыццёвага поспеху. Жанчына верыць: зраблю пластычную аперацыю, і ўсё наладзіцца. Гэта наогул няправільная ўстаноўка, і многія практыкі лічаць яе супрацьпаказаннем да аперацыі. Але жыццё паказвае: вырашыўшы тую ці іншую праблему знешнасці, людзі, здараецца, сапраўды неўзабаве знаходзяць работу мары ці ствараюць сям'ю. І ўсё ж вельмі важна ўсведамляць: прызначэнне пластыкі — карэкціраваць знешнасць, а не характар, унутраны свет або знешнія абставіны. Ніводнае свяціла хірургіі не падорыць вам упэўненасць у сабе. Гэта пытанне прыняцця: або чалавек сябе цалкам не прымае (і тут не дапаможа пластычны хірург), або ёсць нейкі адзін нюанс знешнасці, які перашкаджае ў сабе паверыць. Нават у гэтым, апошнім, выпадку цалкам рэальна паверыць у сябе і без усялякіх пластычных аперацый, але гэта ўжо не пра хірургію, а пра псіхалогію...

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

ИЗВЕЩЕНИЕ

# Государственное производственное объединение «Минскстрой»

доводит до сведения заинтересованных лиц информацию о внесении изменений в проектную декларацию о строительстве жилых помещений и машино-мест в составе объекта **«Комплекс жилой застройки «Уютный». Группа многоквартирных многоэтажных жилых домов в районе улиц Подлесной – Парниковой – Дачного проезда». Первая очередь строительства. Жилой дом № 2 по ГП. Многоуровневая гараж-стоянка № 3.1 по ГП**,

*опубликованную в газете «Звязда» от 17.05.2023 № 92 (29972) с дополнениями от 30.05.2023 № 101 (29981), от 16.06.2023 № 114 (29994), от 28.07.2023 № 144 (30024), от 25.08.2023 № 164 (30044), от 08.09.2023 № 174 (30054), от 04.10.2023 № 192 (30072), от 16.12.2023 № 244 (30124), от 24.02.2024 № 39 (30173), от 21.03.2024 № 57 (30191):*

**Объект долевого строительства – квартира с машино-местом.**

**Сведения об этапах строительства и сроках его реализации:**

Срок начала строительства объекта – 29 апреля 2023 года.

Нормативная продолжительность строительства объекта 18 месяцев.

Предполагаемый срок завершения застройщиком строительства объекта и ввода в эксплуатацию в соответствии с проектом организации строительства – 28 октября 2024 года.

**Условия ознакомления с объектами долевого строительства и ходом работ по ним:** ознакомиться можно в офисе застройщика ГПО «Минскстрой».

**Для заключения договоров создания объекта долевого строительства** (далее – договор) на дату опубликования настоящих изменений в декларацию предлагаются 16 (шестнадцать) квартир с учетом приобретения машино-места, находящихся на 1-5 уровнях в гараж-стоянке № 3.1 по генплану в составе объекта строительства, в том числе:

**1 (одна) однокомнатная квартира:**

- № 322 (общая площадь 39,34 кв. м).

**9 (девять) двухкомнатных квартир:**

- № 72, № 279 (общая площадь 64,9 кв. м каждая);
- № 84 (общая площадь 63,79 кв. м);
- № 131 (общая площадь 63,97 кв. м);
- № 136 (общая площадь 63,87 кв. м);
- № 148 (общая площадь 63,72 кв. м);
- № 173, № 179, № 191 (общая площадь 69,53 кв. м каждая).

**6 (шесть) трехкомнатных квартир:**

- № 59 (общая площадь 85,93 кв. м);
- № 71 (общая площадь 87,11 кв. м);
- № 146 (общая площадь 85,87 кв. м);
- № 178 (общая площадь 92,39 кв. м);
- № 251 (общая площадь 81,31 кв. м);
- № 344 (общая площадь 83,17 кв. м).

**Цены на объекты долевого строительства:**

Стоимость строительства 1 м$^2$ общей площади объектов долевого строительства без выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет:

Также сообщаем о внесении изменений в декларацию в части приобретения жилых помещений совместно с машино-местом в гараж-стоянке № 3.1 по генплану.

Стоимость 1 м$^2$ машино-места при 100 % оплате, при рассрочке платежей, бел. рублей:

- для машино-мест, находящихся на 1–3 уровнях паркинга 1 750,00 белорусских рублей.

- для машино-мест, находящихся на 4 и 5 уровнях паркинга 1 595,68 белорусских рублей.

**Условия оплаты для квартир, содержащихся в настоящем извещении:**

при условии единовременной оплаты **жилого помещения и машино-места** расчет должен быть произведен дольщиком в течение 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме;

при условии единовременной оплаты **жилого помещения** расчет должен быть произведен дольщиком в течение 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме. При оплате **машино-места** согласно графику платежей размер первоначального взноса составляет 40 % от стоимости объекта долевого строительства. Оставшаяся сумма по договору оплачивается ежемесячно равными долями в соответствии с графиком платежей к договору создания объекта долевого строительства по сентябрь 2024 года. Оплата первоначального взноса должна быть произведена дольщиком в течение 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме;

при условии оплаты **жилого помещения и машино-места** согласно графику платежей к договору создания объекта долевого строительства первоначальный взнос по жилому помещению и машино-месту составляет 40 % от стоимости объекта долевого строительства. Оставшаяся сумма по договору оплачивается ежемесячно равными долями в соответствии с графиком платежей к договору создания объекта долевого строительства по сентябрь 2024 года. Оплата первоначального взноса должна быть произведена дольщиком в течение 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме;

| Номер квартиры | Подъезд | Этаж | Количество комнат | Площадь жилого помещения (квартиры), м$^2$ | Стоимость 1 м$^2$ при 100 % оплате, бел. рублей | Стоимость 1 м$^2$ при рассрочке платежей, при условии кредитования в рамках партнерских кредитных программ*, бел. рублей | Стоимость 1 м$^2$ машино-места при 100 % оплате, при рассрочке платежей, бел. рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 322 | 6 | 8 | 1 | 39,34 | 5 500,00 | 5 729,00 | 1–3 уровни паркинга – 1 750,00<br>4 и 5 уровни паркинга – 1 595,68 |
| 173, 179,191 | 4 | 2, 4, 8 | 2 | 69,53 | 4 000,00 | 4 166,00 | |
| 72, 84, 131, 136, 148, 279 | 2, 3, 5 | 7, 8, 11, 13 | 2 | 63,72-64,9 | 4 400,00 | 4 583,00 | |
| 178 | 4 | 4 | 3 | 92,39 | 4 000,00 | 4 166,00 | |
| 59, 71, 146, 251 | 2, 3, 5 | 5, 8, 11 | 3 | 81,31-87,11 | 4 300,00 | 4 479,00 | |
| 344 | 6 | 12 | 3 | 83,17 | 4 600,00 | 4 791,00 | |

**Банками партнерами являются ОАО «АСБ Беларусбанк», ОАО «Белинвестбанк».*

при кредитовании в рамках партнерской кредитной программы **жилого помещения** финансирование строительства по объекту долевого строительства производится единовременно в полном объеме стоимости объекта. Оплата должна быть произведена дольщиком в течение 25 (двадцати пяти) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме. При условии единовременной оплаты **машино-места** расчет должен быть произведен дольщиком в течение 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме;

при кредитовании в рамках партнерской кредитной программы **жилого помещения** финансирование строительства по объекту долевого строительства производится единовременно в полном объеме стоимости объекта. Оплата должна быть произведена дольщиком в течение 25 (двадцати пяти) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме. При оплате **машино-места** согласно графику платежей размер первоначального взноса составляет 40 % от стоимости объекта долевого строительства. Оставшаяся сумма по договору оплачивается ежемесячно равными долями в соответствии с графиком платежей к договору создания объекта долевого строительства по сентябрь 2024 года. Оплата первоначального взноса должна быть произведена дольщиком в течение 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме.

Заявления о заключении договоров будут приниматься (регистрироваться) со следующего дня после публикации настоящего извещения о внесении изменений в проектную декларацию в порядке очереди по адресу: ул. К. Маркса, 13а, каб. 105. Договоры создания объектов долевого строительства будут заключаться после получения уведомления от ГПО «Минскстрой» (по средствам телефонной связи, сообщения в Viber, Telegram), но не ранее 7 (семи) календарных дней после опубликования настоящей декларации по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13а, каб. 105 с физическими и юридическими лицами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

Для подачи заявления и заключения договора необходимо наличие:

для физических лиц – паспорта (биометрического документа, удостоверяющего личность), доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке;

для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей: документа, подтверждающего полномочия представителя, паспорта (биометрического документа, удостоверяющего личность) представителя, копии свидетельства о государственной регистрации и Устава.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве после уведомления не явился в течение 3 рабочих дней для заключения договора и письменно не сообщил об уважительных причинах своей неявки в Viber, Telegram, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ГПО «Минскстрой» оставляет за собой право заключить договор на заявленный объект долевого строительства с другим претендентом.

ГПО «Минскстрой» имеет право отказать в заключении договора создания объекта долевого строительства без объяснения причин.

Условия декларации, не измененные (не исключенные) настоящим извещением, остаются неизмененными.

Подробные сведения об объекте строительства, планировках квартир и ходе строительства можно получить в отделе реализации объектов недвижимости и жилья по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13а, каб. 105, тел. моб. +375 29 195 18 21 либо на сайтах: https://minskstroy.by, http://www.uyutnyi.by.

# ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Коммунального дочернего унитарного предприятия «Кинотехпром» (продавец) в лице председателя ликвидационной комиссии Саковича В.П. извещает о проведении 22 мая 2024 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 70 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, каб. 2.9

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** затраты по переоформлению документов на переход права собственности возлагаются на Покупателя | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 350/С-81185,** общей площадью **3 264,4** кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **здание административно-хозяйственное. Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10.<br>**Капитальное строение с инв. № 350/С-167549,** общей площадью **7,7** кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **здание административно-хозяйственное (проходная). Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10/2.<br>**Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000002006414** общей площадью **0,2036 га (право постоянного пользования). Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10.<br>**Капитальное строение с инв. № 350/С-190188,** общей площадью **0,0** кв. м, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – **водопроводная сеть. Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, водопроводная сеть от ВК1 до зданий по ул. Федюнинского, 10. **Информация о земельном участке:** 340100000002006040 (присвоен предварительно).<br>**Капитальное строение с инв. № 350/С-167548,** общей площадью **0,0** кв. м, назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – **тепловая сеть. Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, тепловая сеть, от ТК-1 до здания по ул. Федюнинского, 10. **Информация о земельном участке:** 340100000002005572 (присвоен предварительно).<br>**Капитальное строение с инв. № 350/С-190467,** общей площадью **0,0** кв. м, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – **дождевая канализационная сеть. Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, дождевая канализационная сеть по ул. Федюнинского, 10. **Информация о земельном участке:** 340100000002006043 (присвоен предварительно).<br>**Капитальное строение с инв. № 350/С-190187,** общей площадью **0,0** кв. м, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – **сеть канализации. Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, канализационная сеть от КК1 до КК7 по ул. Федюнинского, 10.<br>**Информация о земельном участке:** 340100000002006039 (присвоен предварительно).<br>**Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000002006412** общей площадью **0,1070 га (право постоянного пользования, доля в праве – 33/50). Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10.<br>**Также в состав лота № 1 входит:** сооружение – забор железобетонный (литер в, протяженность 52,8 п. м). Сооружение – забор железобетонный (литер и, протяженность 53,92 п. м). Сооружение – забор металлический (литер б, протяженность 13,1 п. м). Сооружение – ворота металлические с электроприводом (литер г, протяженность 8,9 п. м, инв. № 255). Сооружение – ворота (литер д, протяженность 5,69 п. м, инв. № 01361030). Сооружение – тротуар (литер ж, площадью 31 кв. м, инв. № 01361033). Сооружение – бордюры (литер к, протяженность 57,52 п. м, инв. № 01361034). Сооружение – часть дворового покрытия, инв. № 01361031 (площадью 1 124,0 кв. м). Обдирочно-заточной станок 3Б632, инв. № н/д. Лифт грузовой без проводника, г/п 1000 кг, зав. № 3508, 1979 год выпуска, инв. № н/д. Трансформатор трехфазный, зав. № 8657, тип ТМФ-250/10-75У1, мощность 250 кВА, напряжение 10/0,4 кВ, частота 50 Гц, масса 1300 кг, охлаждение – масляное, дата выпуска – 1984 г., дата ввода в эксплуатацию – декабрь 1984 г., инв. № н/д. Трансформатор трехфазный, зав. № 81666, тип ТМ-250/10-75У1, мощность 250 кВА, напряжение 10/0,4 кВ, частота 50 Гц, масса 1420 кг, охлаждение – масляное, дата выпуска – 1972 г., дата ввода в эксплуатацию – декабрь 1984 г., инв. № н/д. Стеллаж комбинированный металлический № 1, размер 4,2х2,2х0,6 м, количество полок 6, инв. № н/д. Стеллаж комбинированный металлический № 2, размер 4,2х2,2х0,6 м, количество полок 6, инв. № н/д. Стеллаж комбинированный металлический № 3, размер 4,4х2,4х0,6 м, количество полок 6, инв. № н/д. Стеллаж комбинированный металлический № 4, размер 4,8х2,4х0,6 м, количество полок 6, инв. № н/д. Стеллаж комбинированный металлический № 5, размер 4,8х2,4х0,6 м, количество полок 6, инв. № н/д. Стеллаж комбинированный металлический № 6, размер 4,8х2,4х0,6 м, количество полок 6, инв. № н/д. Забор металлический (в разобранном виде) (литер а, протяженность 32,66 п. м, инв. № 01361028), расчетная масса металла – 136 кг | 560 692,80 | 56 069,28 |

**Продавец:** Коммунальное дочернее унитарное предприятие «Кинотехпром», 246007, г. Гомель, ул. Федюнинского, д. 10.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (029) 647-81-95 – Сакович Вадим Павлович.**

**Шаг аукционных торгов –** 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 15 мая 2024 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 20 мая 2024 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.

**В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **15 (пятнадцати) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи.

Проводится аукцион в соответствии с Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 №16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607).

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 27.07.2023 г. № 143 (30023).**

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-56, 8 (044) 599-18-16.**

# Отчет за 1-й квартал 2024 года ООО «Санта Ритейл»

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 марта 2024 года

тыс. руб.

| АКТИВЫ | Код строки | На 31.03.2024 | На 31.12.2023 |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 453 111 | 471 549 |
| Нематериальные активы | 120 | 4 002 | 4 002 |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 8 869 | 8 925 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 155 | 8 822 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | 0 | 0 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | 19 552 | 19 423 |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | 450 | 435 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **486 139** | **513 156** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 138 027 | 165 688 |
| в том числе: материалы | 211 | 11 200 | 11 582 |
| готовая продукция и товары | 214 | 126 827 | 154 106 |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | 0 | 0 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 381 | 252 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 267 | 443 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 42 776 | 47 871 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | 0 | 379 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 24 583 | 46 845 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | 78 | 1 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **206 112** | **261 479** |
| **БАЛАНС** | **300** | **692 251** | **774 635** |
| СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | Код строки | На 31.03.2024 | На 31.12.2023 |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 164 655 | 164 655 |
| Резервный капитал | 440 | 15 | 15 |
| Добавочный капитал | 450 | 179 021 | 179 055 |
